PolotskSU



УДК 903.211.3-034.35’6 (476.5)«637»

**МЕТАЛІЧНАЯ СЯКЕРА ЯК ПАКАЗНІК АБМЕННЫХ СУВЯЗЯЎ ПАДЗВІННЯ Ў ЭПОХУ БРОНЗЫ**[1]

**Лебедзь В.А.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*На левобережье Западной Двины у деревни Залесье Полоцкого района Витебской области найден бронзовый топор с закраинами. В июле 2017 он поступил в Полоцкий краеведческий музей. Основные морфологические черты топора – это его форма: прямая обушковая и округло-трапецевидная рабочая части, закраины с ввогнутостью внутрь, плоская основа топора. Отличается от других типов топоров с закраинами формой закраин и формой нижней половины. Определяются также схожие черты с топорами с закраинами 1–3 ПЭБ*[2]*, с уступчатыми топорами 2–3 ПЭБ и с топорами с крыльями 3–1 половины 4 ПЭБ.*
*Вероятно, что топор с закраинами с Залесья был изготовлен в те времена, когда в Европе уже использовались топоры с крыльями. Поэтому предварительно топор с Залесья можно датировать 3 – началом 4 ПЭБ (1300–1000 гг.до н.э.). Водный путь проникновения подобных топоров прослеживается с Восточной Прибалтики по реке Западная Двина.*
***Ключавыя словы:*** *металлический топор, Подвинье.*

У ліпені 2017 года ад наваполацкага рупліўцы Міхаіла Варанько ў Полацкі краязнаўчы музей (філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка) паступіла металічная сякерка (мал. 1). Выраб належыць да катэгорыі сякер з закраінамі. Гэтая сякерка з’ўляееца адзіным металічным вырабам эпохі бронзы са збораў музея[3]. Па прычыне адсутнасці ў музеі дакладнай пісьмовай інфармацыі аўтару не ўдалося высвятліць усе акалічнасці і абставіны выяўлення сякеры. Вядома толькі (паводле вусных звестак супрацоўнікаў музею), што артэфакт знайшлі прыблізна ў 20 км на паўднёвы захад ад Полацку, на полі, якое знаходзіцца на поўдзень ад вёскі Залессе Ветрынскага с/с і на поўнач ад шашы Р45 Вільня – Полацак (мал. 2). Тэрыторыя адосіцца да басейну ракі Шчабірка (правы прыток ракі Нача), што ў левабярэжжы Заходняй Дзвіны.




**Малюнак 1. – Металічная сякера з Полацка**

Знаходкі з металу эпохі бронзы надзвычай рэдкія і каштоўныя для рэгёна Падзвіння. Гэта звязана як са слабой археалагічнай даследаванасцю гэтай тэрыторыі, так і з вялікай аддаленасцю дадзенага рэгіёна ад асноўных горна-металургічных цэнтраў і з высокай каштоўнасцю абменнага тавара. Паводле сабраных аўтарам звестак на тэрыторыі Беларускага Падзвіння зафіксаваныя медныя і бронзавыя вырабы перыяду 2–1 тыс.да н.э. складаюць невялікі спіс, гэта; 4 шылы, іголка, скроневае колца, нож, наканечнік стралы і 6 (цяпер 7) сякер. Калекцыю сякер прадстаўляюць дзве сякеры з ваколіц суседніх вёсак Мікасецк і Навасёлкі (Мядзельскі раён Мінскай вобласці) [3, с. 125] і чатыры ўтулкавыя сякеры: Афяроўшчына (цяпер Афераўшчына, Ушацкі раён Віцебскай вобласці) [11, с. 51–74], з ваколіц горада Лепель (раённы цэнтр Віцебскай вобласці) [13, с. 505–509, 520, мал. 1:4] і два кельты меларскага тыпу – з ваколіц вёскі Дудкі (Расонскі раён Віцебскай вобласці) [14, с. 135–136] і з рэчышча ракі Чарніца (Віцебскай вобласці) [2, с. 57–59]. Прычым з усяго спісу сякер дайшлі да нас і захоўваюцца ў фондах музеяў толькі дзьве (Дудкі і Чарніца).

Тыпалагічнае даследванне сякеры дазваляе прасачыць – з носьбітамі якіх менавіта цэнтраў бронзаліцейнай вытворчасці кантактавала мясцовае насельніцтва; а таксама правесці тыпалагічную, прасторавую і храналагічную ідэнтыфікацыю з аналагічнымі вырабамі найперш на сумежных тэрыторыях. Дэталёвы аналіз складнікаў метала мог бы дапоўніць інфармацыю аб паходжанні сякеры. Як спецыфічны тып металічных сякер, сякера з Залесся Полацкага раёна зьяўляецца важнай крыніцай інфармацыі і дазваляе закрануць наступныя праблемы: абазначыць спецыфіку тыпа металічнага вырабa, які трапіў на Падзвінне; абазначыць месца сякеры ў сістэме аналагічных і тыпалагічна блізкіх знаходак Усходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы і прапанаваць найбольш верагодны накірунак паступлення выраба ў рэгіён і тым самым закрануць тэму абменных сувязяў у эпоху бронзы.

[1] Артыкул друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі.
[2] ПЭБ – перыяд эпохі бронзы.
[3] У фондзе музея сякера паводле пашпарту знаходкі мае інвентарны нумар КП039106, а на самой сякерцы напісана: КП-23 39106.

PolotskSU






**Малюнак 2. – Карта з пазначэннем в. Зялессе Полацкага раёна**

**Тыпалагічна-храналагічная характарыстыка** (металаграфічны і хімічны аналізы выраба пакуль што не праводзіліся**)**. Стан захаванасці сякеры з Залесся добры, яна цэлая і мае неістотныя пашкоджанні. (мал. 1). Пры візуальным разглядзе заўважаецца карозія металічнай паверхні і лёгкаўтваральнасць драпін. Колер каразіраваных месцаў ярка-зялёны ў паглыбленнях, то месцамі руды. Вялікая колькасць выбоінак-карозій па ўсёй паверхні сякеркі сведчыць аб няякасным, хутчэй брудным, метале, які верагодней за ўсё атрымалі ў выніку пераплаву сапсваных прадметаў. Таксама на знешнім выглядзе пакінулі сваё адлюстраванне прыродныя ўмовы, у якія трапіў выраб (наяўнасць вокіслаў, рудыя плямы). На запатрабаванасць сякеры і яе колішняе выкарыстанне ў працы ўказвае скошанасць ляза, сцёртасць з аднаго боку, якая нагадвае нахіл для сякучых дзеянняў. Верагодна, тэхналогіяй вырабу магло быць ліццё ў аднаразовай (магчыма, керамічнай) форме з далейшай падкоўкай. Аб добрай пракоўцы сведчыць як адсутнасць слядоў ліцейнага шва, так і загнутая форма закраін.

Паводле сваіх памераў сякера параўнальна невялічкая: агульная даўжыня 9,3 см (у той час як аналагічныя вырабы з Прыбалтыкі і Польшчы пераважна маюць даўжыню каля 15 см), шырыня ляза 5,0 см, шырыня абушка амаль 2,0 см, таўшчыня сякеры 0,6 – 0,75 см. У бакавой праекцыі корпус сякеры роўны, ледзь нахілены ў абушковай частцы. Абух (у праекцыі зверху) прамавугольны з ледзь закругленымі і адным прамым кантамі. Форма сякеры своеасаблівая для сякер з закраінамі (у франтальнай праекцыі) – верхняя абушковая частка прамая, а ніжняя палова выразна-плаўна пашыраецца, нагадваючы трапецыю з акруглымі абрысамі і ледзь пашыранымі канцамі. Лязо скошана-закругленае, ледзь скошаная паласа навастрэння ляза складае шырыню 0,8–1,0 см (сцёртае лязо з аднаго боку).

Бакавінкі-закраіны аказаліся незвычайнымі для свайго тыпу. Бакавіны акруглыя, без слядоў ліцейнага шва. Закраіны пачынаюцца ніжэй краю абуха (на 1 см) і цягнуцца па ўсёй даўжыні сякеры. Выступаюць над корпусам у сярэдняй частцы адна на 0,65, другая на 0,75 см. Незвычайнай і рэдкай асаблівасцю закраін можна назваць іх загнутасць да цэнтру, што назіраецца ў сярэдняй частцы сякеры, дзе закраіны найбольшыя і выразныя, і складае 0,1 см (але адна закраіна неўвагнутая,

PolotskSU



размешчана пад прамым вуглом). Такая асаблівасць з'яўляецца прыкметай іншага віду – сякерак з крылкамі. Аднак у сякерак з крылкамі ў цэлым іншая канструкцыя бакавін.

Такім чынам, асноўныя марфалагічныя рысы сякеры з Полаччыны: прамы верх (абушковая частка), акругла-трапецаваты ніз (лёзавая частка), закраіны (якія цягнуцца па краю абушковай і пашыранай лёзавай частках сякеры) з увагнутасцю, аснова сякеры плоская.

Прамых аналагаў знаходцы з Залесся выявіць не ўдалося. Таму звернемся да пошуку стылістычна блізкіх па тыпу сякер з падобнымі формамі працоўнай часткі і закраін.

Сякерка з Полаччыны паводле агульнай сваёй формы адносіцца да сякер з закраінамі. Самым блізкім тэрытарыяльна, падобным вырабам можна назваць сякеру з закраінамі з ваколіц мястэчка Новы Быхаў Быхаўскага раёна Магілёўскай вобл (правабярэжжа Дняпра), малюнак якой быў апублікаваны К.М.Палікарповічам у 1928 годзе [9, с.32; 12, с. 177–178; 13, с. 519–520]. (Адлегласць ад Полацка – 330 км на поўдзень – паўднёвы ўсход).

Сярод вялікай колькасці сякерак з закраінамі тэрыторыі Польшчы, даследаваных і скласіфікаваных Анджэем Шпунарам і Войцэхам Блаерам, сякерка з Полаччыны не знаходзіць блізкіх аналагаў. Аднак падобныя сякеры – толькі з плаўна пашыранымі бакавінамі (ад верху да нізу без перападаў формы) і са звычайнымі закраінамі (пад прамым вуглом і большым) – гэта вылучаныя А. Шпунарам сярод т.зв. «паўночнанямецкіх сякерак з берагамі» найперш тыпы Кладзіска (Kłodzisko) і Валовіцэ (Wałowice), часткова – тып Чубін (Czubin), якія агулам датуюцца па скарбах фазамі BB2–HA2[1] (што адпавядае каля 1500–1400 – 1100–1000 гг. да н.э.) [19 s. 58–69, taf. 19–20, 16, s. 22], гэта сярэдні перыяд 2 ПЭБ – першая палова 4 ПЭБ[2].



**Малюнак 3. – Металічныя сякеры бронзавага веку**
**1–5. сякеры з закраінамі: 1. Новы Быхаў Быхаўскага р. (паводле малюнку Ул.Ф. Ісаенкі) [ 5, с.25, мал.3:1]; 2. Алксна, Плунгескі р.,Рэспубліка Літва, ранні ўсходні тып (паводле Грігалавічене [1, табл. 1: 2]; 3. Мажково (Marzkowo, woj. szczecińskie), Рэспубліка Польшча, тып Кладзіска (Kłodzisko) [18, s. Tabl. ]; 4.), Рэспубліка Польшча, тып Валовіцэ (Wałowice) [18, s.272, Tabl. 24:4]; 5. Мельніца Дужа (Mielnica Duża, woj. konińskie), Рэспубліка Польшча, тып Чубін (Czubin) [18, s…., Tabl.103:6]**
**6–7. сякеры з уступамі: 6. Клайпеда, Рэспубліка Літва, тыпу Клайпеда (Klaipeda) [9, с. 182, мал.3 :4]; 7. Фёдараўск Чэрвеньскага р. [9, с. 182, мал.3 :5]**
**8–10. сякеры з крылкамі: 8. Сторкава (Storkowo, woj. szczecińskie), Рэспубліка Польшча, тып лужыцкі [18, s.416, Tabl. 168:2–3]; 9. Služэюў (Służejów, woj. wałbrzyskie), Рэспубліка Польшча, тып Ліноўна (Linowno) [18, s.409, Tabl.161:7]; 10. … , Рэспубліка Польшча, тып Ліноўна (Linowno) [18, s…., Tabl.77:2]**

Сякеркам тыпу Валовіцэ (Wałowice) характэрны падоўжаны трапецаваты выгляд, расшыранае лязо, прыблізна паралельныя бакавіны, закраіны высокія і доўгія (ад абуха да ляза) (мал.3: 4). Тып распаўсюджаны ў Заходнім Памор'і, сягае Сярэдняй Польшчы, датуецца ў межах 2 ПЭБ і пачатку 3 ПЭБ [16, s. 22–23, 19, s. 64–65].

Для сякерак варыянту В тыпу Кладзіска (Kłodzisko) паводле В.Блаера, датаваных па скарбах на 2 ПЭБ, іх распаўсюджаных у арэале ад Памор'я да Мазовіі ўключна, характэрны трапецаваты выгляд, злёгку пашыранае лязо, прамым абухом і плоскім ровікам, берагі могуць быць нізкія або высокія, бакавіны маюць трохплошчавае фацэтаванне (мал.3:3). Датаванне тыпу Кладзіска (Kłodzisko) паволе скарбаў: сярэдн-позні 2 ПЭБ – ранні 3 ПЭБ [16, s. 22]

Да сякерак тыпу Чубін (Czubin) належаць масіўныя сякеркі трапецаватага выгляду з высокімі берагамі і плоскім раўком, лязо пашыранае (мал.3: 5). Выступае ў Сярэдняй Польшчы, на Мазовіі і на Куявах увесь 3 ПЭБ [19, s. 67–69].

Ва Ўсходняй Прыбалтыцы сякеры з закраінамі блізкія разглядаемай – сякеры ўсходняга тыпу, якія датуюцца 1 ПЭБ (напрыклад, сякера з Алксны даўжынёй 10,8 см) (мал. 3: 2) [1, с. 16–17, табл. 1]. Аднак найбольшае падабенства сякеры з Залесся адзначаецца з уступчатымі сякеркамі Ўсходняй Прыбалтыкі і Ўсходняй Беларусі (Падняпроўе).

Сякеры з закраінамі і з уступам-пяткай былі шырока распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Еўропы ў раннім і сярэднім бронзавым веку. Бліжэйшыя ўступчатыя сякеры паходзяць з Верхняга Падняпроўя: Гомель, Прыбар Гомельскага раёна, Фёдараўск Чэрвеньскага раёна (мал. 3: 7) [7, с. 13–17; 8, с. 183] і Канава Рагачоўскага раёна. Яны адрозніваюцца ад сякеры з Залесся найперш прысутнасцю уступа. Гэтыя артэфакты, і асабліва сякера з Фёдараўска, нагадваюць адпаведныя ўсходнебалтыйскія сякеры з уступамі, картаграфію якіх прапанавала Агнія Чывілютэ і ўдакладніў Мікола Крывальцэвіч.

[1] паводле Марэка Гэдла [21, s. 22] на аснове перыядызацыйнай сістэмы бронзавага веку, распрацаванай для Цэнтральнай Еўропы Паўлем Рэйнэкам.
[2] Перыядызацыйная сістэма Оскара Мантэліуса для бронзавага веку Паўночнай Еўропы.

PolotskSU



Гэтыя ўступчатыя сякеры хутчэй за ўсё пранікалі з усходне-прыбалтыйскіх рэгіёнаў на тэрыторыю Беларусі праз Бярэзіну на Дняпро напрацягу 2–3 ПЭБ [17, p. 91, żemel 4; 8, с. 183].

З уступчатымі ўсходнебалтыйскімі сякерамі тыпу Клайпеда (3 ПЭБ) выраб з Залесся мае такія марфалагічныя элементы падабенства, як прамая абушковая, трапецападобная працоўная частка і адсутнасць уступа, а адрозніваецца сваім прамым, а не жалабкаватым паглыбленнем на абуху і формай закраін (мал. 3: 6) [1, с. 23, 73,82, табл. V1:3,7; 8, с. 184]. Для сякер тыпу Клайпеда вядома ліцейная форма з Заходняй Літвы [17, p. 85–91].

На тэрыторыі Украіны прывазныя сякеры з закраінамі і ўступчатыя з Валынскай і Ровенскай вобл. адносяць да кола эпішнуравых культур і звязваюць з распаўсюджаннем на Валынь унеціцкай традыцыі (Цэнтральнай Еўропы), і тшцінецкай культурай Польшчы (сякера тыпу Гродніца (Grodnica)) [4, с.71, 303, 309].

У пошуках тыпалагічна блізкіх сякер ва ўсходнім накірунку звярнулі ўвагу дзве сякеркі з закраінамі сярэдзіны 2 – пачатку 1 тыс.да н.э. з Паўночна-Заходняй Расіі, дзе яны вядомыя як імпарт з Прыбалтыкі ці Паўночнай Еўропы. Знойдзены на гарадзішчы Гарадок і яго ваколіцах, што на рацэ Шэлонь Наўгародскай вобл. Расійскай федэрацыі[1] [15, с. 272].

Невялікая загнутасць унутар закраін дазваляе шукаць сувязь з канструкцыйна іншымі сякеркамі – сякерамі з крылкамі. Падобныя, трапецаватыя формы сякерак з крылкамі распаўсюджаны ў Сярэдняй Еўропе ў 3–4 ПЭБ. Аднак закраіны-крылкі у такіх сякер маюць выразны характар і размешчаны звычайна ў сярэдняй частцы бакавіны сякеры. Падабенства з сякеркай з Полаччыны некаторых тыпаў гэтых сякер – не толькі наяўнасць увагнутасці закраін, а яшчэ і акруглая выгнутасць тулава з трапецаватай працоўнай часткай. Тут супадаюць такія марфалагічныя элементы, як закраіны-крылкі і плаўнае завужэнне формы сякеры пры і пад выступаючымі крылкамі (у т.н. месцы перахвату), характэрнае для некаторых сярэднееўрапейскіх форм з крылкамі і асабліва для сякер з пяткай і крылкамі. Адзначым такую паралель з сякерамі з крылкамі тыпу Ліноўна (Linowno), якія бытавалі ў Сярэдняй Еўропе ад Верхняга Рэйну да Ніжняй Одры на працягу 3 ПЭБ (мал. 3: 9, 10) [16, s. 26] і з сякерамі з крылкамі «лужыцкага тыпу», якія ўжываліся там жа ў 3 ПЭБ – 1 палове 4 ПЭБ (мал. 3: 8) [16, s.26–27, 134].

Такім чынам, металічная сякера з в.Залессе Полацкага раёна адрозніваецца ад іншых тыпаў сякер з закраінамі формай закраін (невялікая загнутасць унутр у сярэдняй частцы), формай ніжняй паловы ў франтальнай праекцыі (шырокае лязо і звужэнне корпуса ў сярэдняй частцы, выгін бакавін). Згаданыя адрозненні ўласцівыя іншым тыпам сякер – уступчатым сякерам (2 і 3 ПЭБ) і сякерам з крылкамі (3 – першая палова 4 ПЭБ). Сякеры з закраінамі, блізкія нашай, бытавалі ў 1 ПЭБ – першай палове 4 ПЭБ. Таму, ўлічваючы тыпалагічны сінкрэтызм, сякеру з Залесся папярэдне можна датаваць часам бытавання ўсіх трох тэхналогій (ідэй) сякер – з закраінамі, уступчатых сякер і сякер з крылкамі – на 3 – пачатак 4 ПЭБ, а гэта каля 1300–1000 гг.да н.э.

**Аналіз шляху пранікнення знаходкі.** Артэфакт такога роду як металічная сякера несумніўна меў дачыненне да абменных сувязяў тае эпохі. Сведчаннем абмену зьяўляюцца артэфакты, не традыцыйныя, неўласцівыя для разглядаемай тэрыторыі. Ужо сам матэрыял вырабу сведчыць пра гэта, а пацверджанне дае параўнаўча-тыпалагічны аналіз гэтай ”неўласцівай” рэчы. Звычайна пра культурны абмен сведчаць рысы арнаментацыі керамікі, узоры некаторых іншых катэгорый вырабаў. Так, вядома, што яшчэ ў 3–2 тыс да н.э. па Заходняй Дзвіне праходзіў бурштынавы абменны шлях (балтыйскіх упрыгожанняў) з Прыбалтыкі ў Паволжа і Падняпроўе і ў зваротным накірунку (з Верхняга Падняпроўя ў басейн Заходняй Дзвіны і ў Прыбалтыйскі рэгіён), аб чым сведчаць шматлікія элементы керамікі і іншых катэгорый вырабаў сярэднедняпроўскай культуры [5, с. 28–29]. Шмат напісана і пра абмен утулкавымі сякерамі меларскага тыпу 1000–600 гг. ВС, шырока распаўсюджанымі ў Прыбалтыцы, Скандынавіі, Марыйскім Паволжы, у чым бачыцца немалая роля і абменнага шляху Заходняй Дзвіны [2, с.57–59; 10, с. 49–54; 17, p. 181–190].

Заходняя Дзвіна была адным са шляхоў пранікнення металічных вырабаў, у тым ліку і сякер з закраінамі, эпохі бронзы на тэрыторыю Паўночнай Беларусі з прыбалтыйскіх рэгіёнаў. У абменных і камунікацыйных сувязях вялікае значэнне належала Бярэзіне, па якой праз паўночныя раёны Беларусі рэчы траплялі з Балтыі на Падняпроўе [8, с. 179–186; 5, с. 27–31; 6, s. 421–440 і інш]. Артэфакт, які знайшлі каля Залесся, таксама відаць трапіў на Полаччыну па дзвінскаму шляху з прыбалтыйскіх тэрыторый. Сякера з закраінамі з Полаччыны нагадвае па сваёй марфалагічнай стылістыцы прыбалтыйскія знаходкі і некаторыя цэнтральнаеўрапейскія вырабы.

**Заключэнне**. Сякера з закраінамі з в.Залессе мае марфалагічныя асаблівасці ў форме закраін і форме ніжняй паловы, характэрныя для сякер з крылкамі (3 – першая палова 4 ПЭБ) і ўступчатых сякер (2–3 ПЭБ). Прамых аналагаў сякерцы з Залесся не знойдзена, але папярэдне можна яе датаваць на 3 – пачатак 4 ПЭБ, а гэта прыблізна 1300–1000 гг.да н.э. Сякера, альбо дакладней ідэя вырабу такога прадмета, верагодней за ўсё магла трапіць на Полаччыну па водным шляху па Заходняй Дзвіне з Прыбалтыкі. Не выключана таксама, што сякера магла зьявіцца і на месцы ў выніку пераплаўкі прыезджым майстрам-металургам. На карысць такой здагадкі сведчаць як адмысловы стыль выраба, так і якасць метала. Аднак з-за адзінкавасці знаходкі гэта версія чакае свайго доказу.

**Падзякаванні**: Выказваю ўдзячнасць навуковым супрацоўнікам Полацкага краязнаўчага музея, і ў прыватнасці загадчыцы філіяла НПГКМЗ Краязнаўчы музей І.П. Водневай за прапанаваную інфармацыю і супрацоўніцтва, а таксама Міхаілу Варанько які знайшоў і перадаў сякеру ў музей.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Григалавичене, Э.А. Древнейшие металлические изделия в Литве (II–I тыс. до н.э.). / Э.А. Григалавичене, А.К. Мяркявичюс. – Вильнюс : Мокслас, 1980. – 144 с.
2. Зайкоўскі, Э.М., Цыркунова, В.А. Металічныя прылады бронзавага веку Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі / Э.М. Зайкоўскі, В.А. Цыркунова // Гіст.-археалаг. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; навук. рэд. М.І. Лашанкоў – Мінск, 1996. – № 9. – С. 57–60.
3. Исаенко, В.Ф. Археологическая карта Белоруссии / В.Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1976. – Вып. 3 : Памятники бронзового века. – 150 с.
4. Клочко, В.И. Древний металл Украины / В.И. Клочко, А.В. Козыменко. – Киев, 2017. – 368 с.

[1] пра гістарычныя сувязі таксама сведчыць тапаніміка – на рацэ Шэлонь ёсць горад Віцебско, гэта каля 200 км на Пн ад Полацку

PolotskSU




5. Кривальцевич, Н.Н. Двинско-Днепровский коммуникационный и обменный путь 4 тыс. лет назад / Н.Н. Кривальцевич // Наука и инновации: научно-практический журнал. – 2017. – №9. – С. 27–31.
6. Кривальцевич, Н. Территория Беларуси в системе коммуникационных путей: III – начала II тысячелетий до н.э. / Н. Кривальцевич // Archaeologia Bimaris: dyskusje. – 2011. – T. 4: Między Bałtykiem a Morzem Czarnym. Szlaki międzymorza IV – I tys. przed Chr. – S. 421–440 .
7. Крывальцэвіч, М. Новыя знаходкі металічных сякер эпохі бронзы / М. Крывальцэвіч // Археалагічны зборнік. Вып 1. – Мінск, 2006. – С.13–17.
8. Крывальцэвіч, М.М. Каменныя сякеры тыпу Навасёлкі і некаторыя аспекты іх культурна-гістарычнай інтэрпрэтацыі. / М.М. Крывальцэвіч // МАБ Выпуск 28. – Мінск, 2017. – С. 179–187.
9. Лебедзь, В.А. Сякеры з закраінамі на тэрыторыі Беларусі / В.А. Лебедзь // Матэрыялы па археалогіі Беларусі ; навук. рэд. А.М.Мядзведзеў – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Выпуск 18. Даследаванні каменнага і бронзавага вякоў. – С. 32–34.
10. Лухтан, А. Кельты меларского типа в Литве / А. Лухтан // Древности Белоруссии и Литвы. – Минск, 1982. – С.48–54.
11. Палікарповіч, К.М. Вынікі археалогічных даследаванняў на Беларусі пасля кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі / К.М. Палікарповіч. // Вес. Акад. навук БССР. Адз. грамад. навук. – 1947. – Серыя гістарычная, № 1. – С. 51–74.
12. Палікарповіч, К.М. Доследы культур каменнага і бронзавага перыядау ў Усходняй Беларусі / К.М. Палікарповіч // Запіскі аддзелу гуманітарных навук Ін-та беларускай культуры. – Мінск, 1928. – Т. 1, кн.5. Працы кафедры археалогіі. – С. 177–178.
13. Палікарповіч, К.М. Знахадкі прылад бронзавага пэрыоду ў БССР / К.М. Палікарповіч // Запіскі аддзелу гуманітарных навук БАН. – Мінск, 1930. – Т.2, кн. 2: Працы археолёгічнай камісіі. – С. 512–520.
14. Чарняўскі, Максім М. Кельт меларскага тыпу з Расоншчыны (Віцебская вобл.) / Максім М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; навук. рэд. А.Г. Калечыц – Мінск, 1999. – № 14. – С. 135–136.
15. Юшкова, М.А. Металлические изделия эпохи бронзы на Северо-Западе России / М.А. Юшкова // Известия Самарского научного центра РАН. – Самара, 2010. – Т. 12 (34). № 2. – С. 272–277.
16. Blajer, W. Skarby ze starszej i środkowej epoki brązu na ziemiach polskich. / W. Blajer. – Kraków : DWN i Polska Akademia Nauk, Oddział w Krakówe,1999. – 475 s. – (Prace komiaji archeologicznej ; № 30).
17. Čivilytė, A. Žmogus ir metalas priešistoriėje: / A. Čivilytė. – Vilnius : Diemedzio leidykla, 2014. – 272 p.
18. Gedl, M. Epoka brązu i wczesna epoka żelaza w Europie / M. Gedl // Archeologia Pierwotna I Wczesnośredniowieczna. III – Kraków: Nakł. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1985. – 339 s.
19. Szpunar, A. Die Beile in Polen I (Flachbeile, Randleistenbeile, Randleistenmeiβel) / A. Szpunar // Prähistorische Bronzefunde. – München : Beck, 1987. – Abt.IX. Band 16. – 118 p.


## THE METAL AX AS IN THE BRONZE AGE OF THE DZVINA REGION

V. LEBEDZ

*A bronze ax with flanges was found on the left-bank region of the Western Dvina, near the village of Zalesse, Polatsk District, Vitsebsk Region. It was transferred to the Polatsk Museum of Local Lore in July 2017 The main morphological features of the ax are its shape: straight butt end and rounded trapezoidal working parts, flanges with a concavity inward, flat base of the ax. It differs from other types of flanged axes in the shape of the flanges and the shape of the lower part. Similar features are also identified with axes with flanges of the Bronze Age Periods 1–3, with stop-ridged axes of the Bronze Age Periods 2–3 and with axes with wings of the Bronze Age Periods 3– the first half of 4.*
*It is likely that the flanked ax from Zalesse was made at a time when axes with wings were already used in Europe. Therefore, the ax from Zalesse can be preliminarily dated back to time of the Bronze Age Periods 3 – the first half of 4 (1300–1000 BC). The waterway of penetration of such axes can be traced from the Eastern Baltic region along the Western Dzvina River.*
***Key words:** metal ax, Dzvina region.*

УДК 902.2(476.5)

## НАЧАЛЬНЫЙ ЭТАП НОВЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ ВЕРХНЕГО ЗАМКА ПОЛОЦКА (2018–2020 гг.)

**Левко О.Н.**
Республика Беларусь, Минск
**Магалинский И.В.**
Республика Беларусь, Новополоцк
**Кенько П.М.**
Республика Беларусь, Минск
**Коц А.Л., Черевко В.В.**
Республика Беларусь, Новополоцк
**Соловьев А.А., Калбеко Л.Г.**
Республика Беларусь, Полоцк

*Представлены материалы предварительных и начальных археологических исследований, проведенных в 2018 – первой половине 2020 г. на территории Верхнего замка г. Полоцка в рамках реконструкции бывших зданий учреждения здравоохранения в охранной зоне заповедника (Верхний замок) под размещение ГУО «Полоцкое кадетское училище». Установлена мощность культурного слоя на всей площади Верхнего замка, выявлены особенности его залегания и характер напластований, получены дополнительные данные по привязке и размещению храма XII в.*
***Ключевые слова:** Полоцк, Верхний замок, археологические раскопки*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў". Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2** © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.